Падтрымай "Вясну" на PATREON

Хроніка пераследу актывістаў 10 ліпеня дапоўнена

10.07.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, пераслед, затрыманні

Праваабаронцам "Вясны" 10 ліпеня паведамляюць пра затрыманні, суды, пераследы актывістаў ва ўсёй Беларусі і простых людзей на розных падставах: удзел у велапрабегах салідарнасці і акцыях, за крытычныя каментары ў сацсетках і інш.

У Мінску затрыманы актывіст **Яўген Міхасюк**. Ён прымаў удзел у мінскіх велапрабегах салідарнасці. Цяпер ён знаходзіцца ў Цэнтральным РУУСе.



Яўген Міхасюк. Фота: 34mag.net

Сёння раніцай таксама быў затрыманы **Шота Лабжанідзэ.** Дома супрацоўнікі міліцыя правялі ў яго вобшук альбо агляд і канфіскавалі мабільны тэлефон. Прычынай затрымання стала тое, што Шота нібыта напісаў у сацсетках нейкае паведамленне — і з гэтай нагоды на яго паступіла заява ў міліцыю

ад двух грамадзян. Міліцыя праводзіць свае дзеянні ў рамках праверкі па гэтай справе. Мінчука адвезлі ў Галоўнае ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй (ГУБАЗіК).



Мінчук Шота Лабжанідзэ затрыманы і дастаўлены ў ГУБАЗіК

Як стала вядома "Вясне", 10 ліпеня ў першай палове дня на працу да мінчука Шоты Лобжанідзэ прыехалі супрацоўнікі міліцыі і без тлумачэння прычынаў затрымалі яго. Пасля гэтага Шоту павезлі да яго дадому і правялі ператрус альбо агляд, у выніку чаго канфіскавалі яго мабільны тэлефон.

Раніцай, прыкладна ў 7 гадзін, 10 ліпеня супрацоўнікі міліцыі правялі вобшук ў мінчука **Артура Цыбульскага**, у выніку якога канфіскавалі тэхніку. Падстава — нібы той пакінуў каментар у сацсетках 23 чэрвеня. Дзеянні праводзіліся ў парадку крымінальнага працэсу.

У Брэсце участковы **Дубольскі** выклікае ў міліцыю **Марыну Круглову**. Яна ўдзельнічала ў мірных акцыях пратэсту. Таксама ў Ленінскае РАУС Брэста выкліканы **Кірыл Голух**. Яго затрымлівалі 3 ліпеня. Міліцыя пасля затрымання ўзяла ў яго тлумачэнні і перадалі інфармацыю па факту ягонага затрымання ва ўніверсітэт.

Паведамляецца, што ў Салігорску доўгі час не выходзіць на сувязь **Алена Колікова**.

Удзельнікаў велапрабегаў асудзілі да 7 сутак арышту

Таксама 10 ліпеня адбываюцца суды над затрыманымі 9 ліпеня удзельнікамі велапрабегаў салідарнасці **Андрэем Бароўскім** і **Аляксандрам Масяйчуком.** Вядома, што іх судзяць у судзе Цэнтральнага раёна Мінска па арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). Ноч яны правялі ў ізалятары. Суд Цэнтральнага раёна асудзіў удзельнікаў велапрабегаў Бароўскага і Масяйчука **да 7 сутак арышту**. Такія пастановы прынялі суддзі Цэнтральнага раёна Мінска **Юлія Густыр** і **Іван Касцян** адпаведна.

Яшчэ да аднаго мінчука — **Сяргея Лук'янава** — 29 чэрвеня прыходзіла міліцыя з нагоды таго, што ён падпісаны на суполку ў телеграм-канале "Армия с народам", піша TUT.BY. Пры гэтым мужчыну забралі ў ізалятар, а на наступны дзень ён быў прызнаны вінаватым у адміністрацыйным правапарушэнні па арт. 23.4 і 23.5 КаАП.

Калі міліцыянты апынуліся ў кватэры, то, як паведамляе Лук'янаў, да яго ўжылі сілу, у тым ліку задушлівы прыём, павалілі на падлогу, а затым надзелі на яго кайданкі. Якія бачылі ўсе дзеці ад спалоху расплакаліся, а жонцы стала дрэнна. Супрацоўнікі забралі ў сям'і тэлефоны, а затым самі выклікалі хуткую жанчыне. Як аказалася, прычынай іх візіту стаў ператрус, звязаны з «праверкай па фактах заклікаў да гвалтоўнай змены ўлады» ў телеграм-канале «Армия с народом».

Мужчына піша, што суткі правёў у ІЧУ, а на наступны дзень суд прызнаў яго вінаватым у непадпарадкаванні законным патрабаванням прадстаўнікоў органаў правапарадку, а таксама абразе службовай асобы пры выкананні службовых паўнамоцтваў — у пастанове гаворыцца пра тое, што ён падаў на падлогу, выштурхоўваў з кватэры і хапаўся за вопратку супрацоўніка, а таксама славесна яго абразіў. У выніку ён быў прысуджаны да штрафу ў памеры **50 базавых велічынь** (1350 беларускіх рублёў).

У **Рэчыцы** міліцыя збіраецца праводзіць вобшук у валанцёркі ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай **Бажэны Жолудзь.** Яе забралі з працы і павезлі ў дом.

Калі вас ці вашых знаёмых затрымалі, просім паведаміць праваабаронцам: +37529-841-39-81 (Signal, WhatsApp, Telegram).

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY